Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях
_________________ В. І. Чупрыс
“13” жніўня 2018

Рэгістрацыйны № УД-5190/вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ АНАМАСТЫКА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

**1-21 80 11 - “Мовазнаўства”**

**2018 г.**

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-21 81 05-2012, пастановы “Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь” ад 27.12.2018 № 163 і вучэбных планаў Рэг. № Д 21-249/вуч. ад 26.05.2017, № Д 21з-276/вуч. ад 26.05.2017

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Гапоненка Ірына Алегаўна**, прафесар кафедры гісторыі беларускай мовы, доктар філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі беларускай мовы філалагічнага факультэта
(пратакол № 10 ад 11.05.2018 г.)

Вучэбна-метадычнай камісіяй філалагічнага факультэта БДУ
(пратакол № 6 ад 31.05.2018 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Беларуская анамастыка” – вучэбная дысцыпліна па выбару цыкла дысцыплін спецыяльнай падрыхтоўкі. У ходзе засваення дысцыпліны навучэнцы (магістранты) павінны атрымаць веды адносна структурна-семантычнай і функцыянальна-камунікатыўнай спецыфікі надзвычай важнай часткі слоўнікавага складу мовы – анамастычнай лексікі. На сённяшні дзень анамастычныя пытанні не разглядаюцца ў базавых курсах лінгвістычнага профілю першай ступені адукацыі, нягледзячы на тое, што анамастыка з’яўляецца важнай часткай сучаснай філалагічнай культуры. Наяўнасць сістэматызаваных ведаў у анамастычнай сферы – істотная адзнака кваліфікаванасці для магістрантаў, якія ўваходзяць як прафесіяналы ў сучасную грамадска-моўную практыку і практыку філалагічных даследаванняў. Паколькі анамастыка мае выразны міждысцыплінарны характар (звязана з гісторыяй, этнаграфіяй, фальклорам) і акумулюе інфармацыю па іншых дысцыплінах (“Дыялекталогія”, “Гісторыя беларускай мовы”, “Сучасная беларуская мова”), яе засваенне будзе садзейнічаць фарміраванню высокага ўзроўню лінгвістычнай і сацыякультурнай кампетэнцыі і паспрыяе паглыбленай навукова-тэарэтычнай падрыхтоўцы спецыялістаў як для далейшага навучання (у аспірантуры), так і для выкладчыцкай дзейнасці.

Асноўныя **мэты** вывучэння дысцыпліны – авалоданне тэарэтычнымі ведамі ў галіне анамастыкі з улікам беларускай нацыянальнай спецыфікі і набыццё практычных уменняў для ўсебаковага лінгвістычнага аналізу розных онімных класаў.

**Задачы** вывучэння дысцыпліны:

- засваенне тэарэтычных ведаў адносна: а) адрознення анамастычнай лексікі ад апелятыўнай і спецыфікі онімаў як моўных элементаў; б) асаблівасцей функцыянавання онімаў у сістэме мовы; в) класіфікацыі беларускай анамастычнай лексікі;
- азнаямленне з асноўнымі дасягненнямі айчыннай і замежнай анамастычнай навукі;
- засваенне асноўных анамастычных паняццяў і авалоданне метадамі даследавання анамастычнага матэрыялу;
- фарміраванне ўяўленняў пра нацыянальную спецыфіку беларускай анамастычнай сістэмы;
- атрыманне інфармацыі пра гісторыю ўзнікнення і этапы фарміравання беларускіх уласных найменняў: антрапонімаў (імёнаў, прозвішчаў, імёнаў па бацьку, мянушак, псеўданімаў) і тапонімаў (айконімаў, мікратапонімаў, гідронімаў);
- фарміраванне навыкаў нарматыўнага пісьмовага афармлення анамастычных адзінак антрапонімаў (уласнабеларускіх і запазычаных)у галіне правапісу, словазмянення, транслітарацыі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць**:

- спецыфічныя адрозненні апелятыўнай і анамастычнай лексікі паводле семантыка-паняційных сувязяў, гісторыка-сацыяльнай абумоўленасці, паходжання, фанемнага складу, граматычных асаблівасцей;
- функцыі розных відаў онімаў у беларускай анамастычнай сістэме;
- асноўныя этапы ў фарміраванні беларускай анамастычнай сістэмы і асаблівасці іменалагічнага працэсу на кожным з гэтых этапаў;
- разнавіднасці афіцыйных і неафіцыйных найменняў, іх функцыянальныя адметнасці і правілы словазмянення;
- розніцу паміж навуковай і народнай анамастычнай этымалогіяй і асноўныя крыніцы, паводле якіх верагодна ўстанавіць паходжанне і семантыку асабовых уласных імёнаў і геаграфічных найменняў;
- характэрныя рысы літаратурных онімаў і іх ролю ў канве мастацкага твора;

**умець:**

- вылучаць анамастычныя адзінкі ў агульнамоўным кантэксце і класіфікаваць іх; карыстацца анамастычнымі паняццямі і тэрмінамі;
- ажыццяўляць карэктны арфаграфічны запіс антрапанімічных адзінак, умець іх скланяць і транслітараваць;
- практычна прымяняць прынцыпы палевай методыкі арганізацыі анамастычнага матэрыялу ў межах канкрэтнага мастацкага твора і ў пісьменніцкім ідыястылі ўвогуле;

**валодаць:**

- навыкамі выкарыстання навуковай літаратуры ў даследчай працы;
- методыкай падрыхтоўкі дакладаў і паведамленняў на навуковых канферэнцыях, курсавых і дыпломных работ па прапанаванай тэматыцы.
- прынцыпамі перадачы анамастычных адзінак з мовы на мову і правіламі міжмоўнай транспартацыі літаратурных онімаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Беларуская анамастыка” ў магістрантаў фарміруюцца наступныя **кампетэнцыі**:

**Акадэмічныя:**

АК-1. Здольнасць да самастойнай навукова-даследчай дзейнасці (аналіз, супастаўленне, сістэматызацыя, абстрагаванне, мадэляванне, праверка дакладнасці дадзеных, прыняцце рашэнняў і інш.). Гатоўнасць генераваць і выкарыстоўваць новыя ідэі.

АК-2. Метадалагічныя веды і даследчыя ўменні, якія забяспечваюць рашэнне задач навукова-даследчай, навукова-педагагічнай, кіраўнічай і інавацыйнай дзейнасці.

АК-3. Здольнасць да самаадукацыі.

**Сацыяльна-асобасныя:**

САК-1. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульнакультурны ўзровень, дамагацца маральнага і фізічнага ўдасканалення сваёй асобы.

САК-2. Карыстацца адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і іншай замежнай мовай як сродкам дзелавых зносін.

САК-6. Лагічна, аргументавана і ясна будаваць вуснае і пісьмовае маўленне, выкарыстоўваць навыкі публічнай прамовы, вядзення дыскусіі і палемікі.

САК-8. Паважліва і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

**Прафесійныя:**

**Навукова-педагагічная і вучэбна-метадычная дзейнасць**

ПК-3. Асвойваць і ўкараняць у навучальны працэс інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі.

ПК-4. Кіраваць навукова-даследчай працай навучэнцаў.

ПК-5. Планаваць і арганізоўваць выхаваўчую работу з навучэнцамі.

ПК-6. Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку навучальных і выхаваўчых вынікаў.

**Навукова-даследчая дзейнасць**

ПК-7. Кваліфікавана праводзіць навуковыя даследаванні ў галіне адукацыі.

ПК-8. Распрацоўваць практычныя рэкамендацыі па ўкараненні навуковых даследаванняў, планаванні і правядзенні эксперыментальных даследаванняў, навукова-тэхнічную дакументацыю.

**Праектная дзейнасць**

ПК-9. Прымяняць сучасную метадалогію ў сферы адукацыі, выкарыстоўваць сродкі аўтаматызацыі праектавання, афармляць праектную дакументацыю.

ПК-10. Праводзіць аналіз праектнай дзейнасці ў гуманітарнай сферы, распрацоўваць прапановы па павышэнні эфектыўнасці планаваных даследаванняў.

**Арганізацыйна-кіраўнічая дзейнасць**

ПК-11. Прымаць аптымальныя кіраўчыя рашэнні.

ПК-12. Асвойваць і рэалізоўваць кіраўнічыя інавацыі ў прафесійнай дзейнасці.

**Інавацыйная дзейнасць**

ПК-13. Распрацоўваць планы і праграмы арганізацыі інавацыйнай дзейнасці, навукова абгрунтоўваць інавацыйныя праекты ў прафесійнай дзейнасці.

ПК-14. Праводзіць даследаванні, заснаваныя на інавацыйных тэхналогіях і методыках (навукова-даследчая дзейнасць).

ПК-15. Выкарыстоўваць дасягненні навукі і перадавых тэхналогій у адукацыйнай і навукова-даследчай сферах.

## Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі

Вывучэнне дысцыпліны “Беларуская анамастыка” ажыццяўляецца з апорай на веды, атрыманыя магістрантамі пры засваенні асноўных раздзелаў дысцыпліны “Сучасная беларуская мова”: фанетыкі, марфалогіі, словаўтварэння, сінтаксісу, лексікі, а таксама дысцыплін “Гістарычная граматыка беларускай мовы”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Беларуская дыялекталогія”.

## Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

Дысцыпліна вывучаецца на II курсе ў 3-ім семестры магістрантамі дзённай і завочнай форм навучання.

Агульная колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэне дысцыпліны “Беларуская анамастыка” на дзённай і завочнай форме навучання складае 162 гадзіны, колькасць аўдыторных гадзін – 42. Аўдыторныя гадзіны размяркоўваюцца па відах заняткаў наступным чынам: на *дзённай* форме навучання 20 гадзін лекцыйных заняткаў, 18 гадзін практычных заняткаў, 4 гадзіны – КСР; на *завочнай* форме навучання 16 гадзін лекцыйных заняткаў, 10 гадзін практычных заняткаў, 16 гадзін – КСР.

Форма выніковай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### ТЭМА 1
### УВОДЗІНЫ. АНАМАСТЫКА ЯК НАВУКА, ЯЕ МЕСЦА Ў СІСТЭМЕ ФІЛАЛАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

**1.1. Прадмет і задачы курса.** Месца курса ў сістэме філалагічнай навукі, яго сувязь з іншымі дысцыплінамі (гісторыяй літаратурнай мовы, лексікалогіяй, сучаснай літаратурнай мовай, дыялекталогіяй). Значэнне анамастыкі як крыніцы ведаў для іншых лінгвістычных і нелінгвістычных дысцыплін. Метады анамастычных даследаванняў. Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў магістратуры.

**1.2. Анамастычная лексіка ў агульнай моўнай сістэме.** Асноўныя паняцці анамастычнай навукі, сутнасць базавых анамастычных тэрмінаў. Спецыфіка анамастычнай лексікі ў параўнанні з агульнай лексікай па наступных параметрах: семантыка-паняційных сувязях, гісторыка-сацыяльнай абумоўленасці, паходжанні, фанемным складзе, асаблівасцях словаўтварэння і словазмянення. Працэсы анімізацыі, апелятывацыі, трансанімізацыі. Віды онімаў.

**1.3. Айчынная і замежная анамастычная лексікаграфія.** Лексікаграфічная сістэматызацыя розных тыпаў онімаў: асабовых імёнаў, айконімаў, мікратапонімаў, урбонімаў, гідронімаў і інш. Перспектыўныя кірункі беларускай анамастычнай лексікаграфіі.

### ТЭМА 2
### АНТРАПАНІМІКА ЯК РАЗДЗЕЛ АНАМАСТЫКІ. СПЕЦЫФІКА БЕЛАРУСКАЙ АНТРАПАНІМІІ.

**2.1. Беларуская антрапаніміка як навука.** Антрапаніміка як раздзел анамастыкі, яе тэарэтычныя і практычныя задачы. Праблема перыядызацыі ўсходнеславянскай антрапаніміі. Славянская антрапанімічная сістэма сярод іншых іменалагічных сістэм свету.

**2.2. Асабовыя імёны**. Асноўныя этапы фарміравання беларускага антрапанімікона (дыхрысціянскі, хрысціянскі, новы перыяды). Адраджэнскі перыяд (XIX – пачатак XX ст.) як своеасаблівы этап ў гісторыі беларускага іменаслова.

**2.3. Імёны па бацьку.** Гісторыя ўзнікнення імёнаў па бацьку; імёны па бацьку ў беларускай іменалагічнай практыцы. Функцыя гэтага іменалагічнага элементу пры называнні беларусаў на пачатку XX стагоддзя.

**2.4. Прозвішчы.** Гісторыя станаўлення прозвішчаў. Час узнікнення прозвішчаў у сусветнай іменалагічнай практыцы. Прычыны ўтварэння прозвішчаў: гістарычныя, сацыяльныя, эканамічныя. Сацыяльная прырода прозвішчаў. Распаўсюджанне прозвішчаў на славянскіх тэрыторыях сярод розных сацыяльных груп насельніцтва.

Класіфікацыя беларускіх прозвішчаў. Групы прозвішчаў у залежнасці ад значэння матывацыйных слоў. Асноўныя словаўтваральныя тыпы беларускіх прозвішчаў. Агульнаславянскія, агульнаўсходнеславянскія, уласна беларускія тыпы. Асноўныя прыметы беларускага прозвішча.

**2.5. Спецыфіка жаночага іменавання.** Адрозненні ў жаночым і мужчынскім іменаванні і яго прычыны. Неафіцыйныя найменні жанчын па мужу і дзяцей па бацьку. Розныя тыпы жаночага іменавання ў старажытнасці і на сучасным этапе.

**2.6. Неафіцыйныя найменні ў антрапанімічнай сістэме.** Спецыфіка індывідуальных мянушак як іменалагічных адзінак. Роля гэтага іменалагічнага элемента на розных этапах развіцця славянскага і беларускага іменніка. Родавыя празванні. Псеўданімы, саманазовы, нікі як антрапанімічная разнавіднасць.

## ТЭМА 3
## ТАПАНІМІКА ЯК РАЗДЗЕЛ АНАМАСТЫКІ. БЕЛАРУСКАЯ ТАПАНІМІЯ ЯК ВАЖНЫ ФРАГМЕНТ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ.

**3.1. Тапаніміка як раздзел анамастыкі.** Тапаніміка як навука пра ўласныя найменні геаграфічных аб’ектаў. З гісторыі беларускай тапанімікі. Развіццё тапанімічнай навукі на сучасным этапе.

Віды класіфікацый тапонімаў. Разнавіднасці тапанімічных найменняў.

**3.2. Айконімы.** Іх структурныя і семантычныя разнавіднасці. Шляхі і заканамернасці ўзнікнення айконімаў, матывы і тыпы намінацыі, іх развіццё, функцыянаванне, тэрытарыяльнае і моўнае распаўсюджванне. Натуральныя трансфармацыі айконімаў і нематываваныя перайменаванні населеных пунктаў.

**3.3. Мікратапонімы.** Мікратапонімы як своеасаблівымі памяткі мінуўшчыны, увасабленне ў мікратапанімічных найменнях фактаў народнага жыцця і быту, гістарычных падзей, сацыяльных і геаграфічных ўмоў былых часоў, даўнейшых асаблівасцей землекарыстання і землеўпарадкавання. Разнавіданасці мікратапанімічных найменняў.

**3.4. Гідронімы.** Гідранімія як найбольш старажытны пласт тапанімічнай лексікі. Першыя ўпамінанні назваў беларускіх рэк і азёр у летапісах і старых картаграфічных матэрыялах. Разнавіднасці найменняў водных аб’ектаў (семантычныя групы і словаўтваральныя тыпы).

## ТЭМА 4
## ЛІТАРАТУРНАЯ АНАМАСТЫКА

**4.1. Спецыфіка літаратурнай анамастыкі.** Онімы як элементы структуры мастацкага твора. Імя як крыніца інфармацыі пра персанаж. Імя і сюжэт твора. «Гаворачыя» прозвішчы і імёны, выкарыстанне такога прыёму ў творах беларускіх аўтараў. Вобразна-выяўленчыя функцыі антрапонімаў у творах вядучых беларускіх пісьменнікаў (В.Дуніна-

Марцінкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, М. Гарэцкага, Кандрата Крапівы, У. Караткевіча і інш).

Імя як маркер інтэртэкстуальнасці.

**4.2. Спосабы і прыёмы іменавання персанажаў.** Гістарычная і сацыяльная абумоўленасць літаратурнай анамастыкі. Эвалюцыя спосабаў іменавання персанажаў мастацкіх твораў: ад абстрактнага гістарызму да рэалістычнага вымыслу. Антанамасія як мастацкі прыём.

## ТЭМА 5
## ПРАКТЫЧНАЯ АНАМАСТЫКА

**5.1. Праблемнае поле практычнай анамастыкі**. Рэгламентацыя напісання, словазмянення, прынцыпаў транслітарацыі онімаў як важнейшая ўмова іх нарматыўнага функцыянавання. Прычыны неўнармаванасці пісьмовага афармлення ўласных імёнаў. Шляхі анамастычнай стандартызацыі.

**5.2. Арфаграфічнае афармленне анамастычнай лексікі.** Неабходнасць спецыфічнага падыходу да пісьмовага афармлення онімаў. Два супрацьлеглыя спосабы пісьмовай перадачы онімаў у перыяд фарміравання правапісных традыцый на пачатку XX стагоддзя. Супярэчлівыя арфаграмы з онімамі (уласнабеларускімі і запазычанымі) у сучаснай пісьмовай практыцы.

**5.3. Скланенне онімаў.** Асаблівасці скланення беларускіх прозвішчаў на пачатковым этапе фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы (XIX – пачатак XX стагоддзя). Сучасныя правілы словазмянення онімаў.

**5.4. Перадача беларускіх онімаў па-руску.** Праблемныя моманты рускай перадачы беларускіх уласных імёнаў, прапановы па іх нармалізацыі. Дзеючыя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць перадачу беларускіх онімаў па-руску.

**5.5. Пытанні транслітарацыі онімаў лацінскай графікай.** Вядучыя міжнародныя прынцыпы раманізацыі нацыянальнай анамастычнай лексікі. Прымяненне традыцыйнай беларускай лацінкі для перадачы тапонімаў у лацінаграфічных кантэкстах. Транслітарацыя беларускіх антрапонімаў лацінскай графікай: аналіз дзеючай сістэмы беларуска-англійскай лацінкі, прапановы па яе ўдасканаленні.

**5.6. Транспартацыя онімаў у іншамоўныя тэксты.** Перадача онімаў на іншыя мовы ў агульнамоўных і мастацкіх кантэкстах. Пытанні перакладу анамастычнай лексікі. Праблема захавання іменалагічнай адэкватнасці пры перакладзе.

**5.7. Вызначэнне матывацыйных асноў онімаў.** Навуковая і народная этымалогія ўласных імёнаў. Онімы з «цёмнай» этымалогіяй, магчымыя спосабы і шляхі яе расшыфроўкі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
## (дзённая форма навучання)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | колькасць гадзін КСР | формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | іншае | | |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** |
| 1 | **Тэма 1. Уводзіны. Анамастыка як навука, яе месца ў сістэме філалагічных дысцыплін.** | **4** | | | | | **2** | |
| | 1.1. Прадмет і задачы курса. | 2 | | | | | | |
| | 1.2. Анамастычная лексіка ў агульнай моўнай сістэме. | 2 | | | | | | |
| | 1.3. Айчынная і замежная анамастычная лексікаграфія. | | | | | | 2 | тэматычныя паведамленні |
| 2 | **Тэма 2. Антрапаніміка як раздзел анамастыкі. Спецыфіка беларускай антрапаніміі.** | **8** | **2** | | | | **2** | |
| | 2.1. Беларуская антрапаніміка як навука. | 1 | | | | | | |
| | 2.2. Асабовыя імёны. | 1 | | | | | | |
| | 2.3. Імёны па бацьку. | 1 | 1 | | | | | практычныя заданні |
| | 2.4. Прозвішчы. | 3 | 1 | | | | | практычныя заданні |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2.5. Спецыфіка жаночага іменавання. | 2 | | | | | | |
| | 2.6. Неафіцыйныя найменні ў антрапанімічнай сістэме. | | | | | | 2 | вуснае апытванне тэматычныя паведамленні |
| 3 | **Тэма 3. Тапаніміка як раздзел анамастыкі. Беларуская тапанімія як важны фрагмент нацыянальна-культурнай спадчыны.** | **5** | **3** | | | | | |
| | 3.1. Тапаніміка як раздзел анамастыкі. | 2 | | | | | | |
| | 3.2. Айконімы. | 1 | 1 | | | | | вуснае апытванне |
| | 3.3. Мікратапонімы. | 1 | 1 | | | | | вуснае апытванне |
| | 3.4. Гідронімы. | 1 | 1 | | | | | вуснае апытванне |
| 4 | **Тэма 4. Літаратурная анамастыка.** | **3** | **1** | | | | | |
| | 4.1. Спецыфіка літаратурнай анамастыкі. | 1 | 1 | | | | | вуснае апытванне |
| | 4.2. Спосабы і прыёмы іменавання персанажаў. | 2 | | | | | | даклад |
| 5 | **Тэма 5. Практычная анамастыка.** | | **12** | | | | | |
| | 5.1. Праблемнае поле практычнай анамастыкі. | | 2 | | | | | вуснае апытванне |
| | 5.2 Арфаграфічнае афармленне анамастычнай лексікі. | | 2 | | | | | тэст |
| | 5.3. Скланенне онімаў. | | 2 | | | | | кантрольная праца |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5.4. Перадача беларускіх онімаў па-руску. | | 1 | | | | | даклад |
| | 5.5. Пытанні транслітарацыі онімаў лацінскай графікай. | | 1 | | | | | тэст |
| | 5.6. Транспартацыя онімаў у іншамоўныя тэксты. | | 2 | | | | | вуснае апытванне |
| | 5.7. Вызначэнне матывацыйных асноў онімаў. | | 2 | | | | | даклад |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
## (завочная форма навучання)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | колькасць гадзін КСР | формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | іншае | | |
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** |
| 1 | **Тэма 1. Уводзіны. Анамастыка як навука, яе месца ў сістэме філалагічных дысцыплін.** | **2** | | | | | **2** | |
| | 1.1. Прадмет і задачы курса. | 1 | | | | | | |
| | 1.2. Анамастычная лексіка ў агульнай моўнай сістэме. | 1 | | | | | | |
| | 1.3. Айчынная і замежная анамастычная лексікаграфія. | | | | | | 2 | тэматычныя паведамленні |
| 2 | **Тэма 2. Антрапаніміка як раздзел анамастыкі. Спецыфіка беларускай антрапаніміі.** | **4** | **2** | | | | **4** | |
| | 2.1. Беларуская антрапаніміка як навука. | | | | | | 2 | тэматычныя паведамленні |
| | 2.2. Асабовыя імёны. | 1 | 1 | | | | | |
| | 2.3. Імёны па бацьку. | 1 | | | | | | практычныя заданні |
| | 2.4. Прозвішчы. | 1 | 1 | | | | | практычныя заданні |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2.5. Спецыфіка жаночага іменавання. | 1 | | | | | | |
| | 2.6. Неафіцыйныя найменні ў антрапанімічнай сістэме. | | | | | | 2 | вуснае апытванне тэматычныя паведамленні |
| 3 | **Тэма 3. Тапаніміка як раздзел анамастыкі. Беларуская тапанімія як важны фрагмент нацыянальна-культурнай спадчыны.** | **5** | **3** | | | | **3** | |
| | 3.1. Тапаніміка як раздзел анамастыкі. | 1 | | | | | | |
| | 3.2. Айконімы. | 2 | 1 | | | | 1 | вуснае апытванне |
| | 3.3. Мікратапонімы. | 1 | 1 | | | | 1 | вуснае апытванне |
| | 3.4. Гідронімы. | 1 | 1 | | | | 1 | вуснае апытванне |
| 4 | **Тэма 4. Літаратурная анамастыка.** | **3** | | | | | **1** | |
| | 4.1. Спецыфіка літаратурнай анамастыкі. | 1 | | | | | 1 | вуснае апытванне даклад |
| | 4.2. Спосабы і прыёмы іменавання персанажаў. | 2 | | | | | | |
| 5 | **Тэма 5. Практычная анамастыка.** | **2** | **5** | | | | **6** | |
| | 5.1. Праблемнае поле практычнай анамастыкі. | 2 | | | | | | вуснае апытванне |
| | 5.2 Арфаграфічнае афармленне анамастычнай лексікі. | | 1 | | | | 1 | тэст |
| | 5.3. Скланенне онімаў. | | 1 | | | | 1 | кантрольная праца |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5.4. Перадача беларускіх онімаў па-руску. | | 1 | | | | 1 | практычныя заданні |
| | 5.5. Пытанні транслітарацыі онімаў лацінскай графікай. | | 1 | | | | 1 | тэст |
| | 5.6. Транспартацыя онімаў у іншамоўныя тэксты. | | 1 | | | | | вуснае апытванне |
| | 5.7. Вызначэнне матывацыйных асноў онімаў. | | | | | | 2 | даклад |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ВУЧЭБНАЯ ЛІТАРАТУРА

### Асноўная

1. Беларуская антрапанімія / Г. М. Мезенка, Г. М. Дзеравяга, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова. – Віцебск, 2009.
2. Бірыла, М. В. Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых моў (рускай, украінскай, польскай) / М. В. Бірыла. – Мінск, 1963.
3. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М. В. Бірыла. – Мінск, 1966.
4. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск, 1969.
5. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: Структура ўласных мужчынскіх імёнаў / М. В. Бірыла. – Мінск, 1982.
6. Бірыла, М. В. Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў / М. В. Бірыла. – Мінск, 1988.
7. Жучкевич В.А. Общая топонимика / В. А. Жучкевич. – Минск, 1980.
8. Мезенка, Г. М. Беларуская анамастыка / Г. М. Мезенка. – Мінск, 1997.
9. Шур, В. Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры / В. Шур. – Мінск, 2002.
10. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны. Беларуская антрапаніміка і тапаніміка / В. Шур. – Мінск, 1998.
11. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны: Беларуская антрапанімія і тапанімія / В. Шур. – Мазыр, 2018.
12. Шур, В. З гісторыі ўласных імёнаў / В.Шур. – Мінск, 1993.
13. Шур, В. Онім у мастацкім тэксце: Манаграфія / В. Шур. – Мінск, 2006.

### Дадатковая

14. Беларуская мова: Энцыклапедыя. – Мінск, 1994 (раздзелы «Анамастыка» і «Антрапанімія»).
15. Бондалетов, В.Д. Русская ономастика: учебное пособие для студентов педагогических институтов по специальности № 2101 “Русский язык и литература” / В.Д. Бондалетов. – М., 1983.
16. Гапоненка, І.А. Беларускія прозвішчы: Упарадкаванне правапіснага афармлення // Роднае слова. – 2006. – № 5. – С. 37-40.
17. Гапоненка, І.А. Перадача беларускіх прозвішчаў лацінкай // Роднае слова. – 2007. – № 6. – С. 22-26.
18. Гапоненка, І. А. Перадача беларускіх прозвішчаў па-руску // Роднае слова. – 2007. – № 4. – С. 37-40.
19. Гапоненка, І.А. Скланенне прозвішчаў // Роднае слова. – 2006. – № 6. – С. 29-33.

20. Лемцюгова, В. П. Антрапанімія I – Імёны (с. 339–347); Антрапанімія II – Прозвішчы (с. 435–442) / В. П. Лемцюгова // Słowiańska onomastyka. Encykłopiedia : T. 1 / pod redakcją Ewy Rzetelskiej-Feleszko i Aleksandry Cieślikowej przy współudziale Jerzego Dumy. – Warszawa–Kraków, 2002.
21. Лемцюгова, В.П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны агналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці / В.П. Лемцюгова. – Мінск, 1970.
22. Лемтюгова, В.П. Восточнославянская ойконимия апеллятивного происхождения / В.П. Лемтюгова. – Минск, 1983.
23. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Литература и искусство, 2008.
24. Мурзаев, Э.М. Слово на карте / Э.М. Мурзаев. – М., 2001.
25. Никонов, В. А. География фамилий / В. А. Никонов. – М., 2008.
26. Никонов, В.А. Имя и общество / В. А. Никонов. – М., 1974.
27. Орфография собственных имён. – М., 1965.
28. Ратнікава, І. Аб некаторых спрэчных пытаннях словаўтварэння імя па бацьку ў сучаснай беларускай мове // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 12. – С. 70-75.
29. Ратникова, И.Э. Имя собственное: от культурной семантики к языковой / И.Э. Ратникова. – Минск, 2003.
30. Рогалев, А.Ф. Этнотопонимия Беларуси (на фоне этнической истории) / А.Ф. Рогалев. – Гомель, 1993.
31. Рылюк, Г.Я. Истоки географических названий Беларуси (с основами общей топонимики) / Г.Я. Рылюк. – Минск, 1997.
32. Рымша, В.П. Беларускія антрапонімы балтыйскага паходжання // Беларуская лінгвістыка. – 1974. – Вып. 6. – С. 46-50.
33. Свашенко, А.А. Происхождение так называемых “тёмных” белорусских фамилий в свете учения А.А. Потебни об именах // А.А. Потебня – исследователь славянских взаимосвязей: Тез. Всесоюз. науч. конф. – Харьков. – 1991. – Ч. 2. – С. 38-40.
34. Суперанская, А. В. Имя через века и страны / А. В. Суперанская. – М., 2007.
35. Суперанская, А. В. О русских фамилиях / А. В. Суперанская, А. В. Суслова. – СПб., 2008.
36. Суслова, А. В. О русских именах / А. В. Суслова, А. В. Суперанская. – Изд. 2-е, испр. и доп. – Ленинград, 1991.
37. Сцяцко, П.У. Да праблемы скланення прозвішчаў на *–а, -я* // Рэгіянальныя асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: Тэз. дакл. і паведамл. - Гомель. – 1990. – С. 103-105.
38. Усціновіч, А. К. Антрапанімія Гродзеншчыны і Брэстчыны (XIV–XVIII стст.) / А. К. Усціновіч. – Мінск, 1975.
39. Усціновіч, А. К. Гістарычная антрапанімія / А. К. Усціновіч // Беларуская лінгвістыка. – 1974. – Вып. 6. – С. 46–50.
40. Усціновіч, Г. К. Імёны-мянушкі ў гродзенскіх і брэсцкіх актах XV-XVII стст. // Лінгвістычныя даследаванні. – Мінск. – 1968. – С. 143-156.

41. Шумская, І. А. Антрапонімы, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека (на матэрыяле гаворак Брэстчыны) / І. А. Шумская // Дыялекталогія і культура беларускай мовы : тэз. рэсп. навук.-практ. канф. – Мінск, 1991. – С. 189–192.

42. Юркенас, Ю. Основы балтийской и славянской антропонимии / Ю. Юркенас. – Вильнюс, 2003.

43. Nazewnictwo na pograniczach etniczno-kulturowych. Studia Sławistyczne. – T. 1. Białystok, 1999.

44. Nazwy własne na pograniczach kulturowych. Studia Sławistyczne. – T. 2. Białystok, 2000.

45. Onomastyka literacka. – Olsztyn, 1993.

**Даведачная**

46. Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа / склад. Г.У. Арашонкава і інш.; пад рэд. М.В. Бірылы. – Мінск, 1990.

47. Баскаков, Н. А. Русские фамилии тюркского происхождения / Н. А. Баскаков. – М., 1979.

48. Блакітны скарб Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 2007.

49. Веселовский, С. Б. Ономастикон: Древнерусские имена, прозвища и фамилии / С. Б. Веселовский. – М., 1974.

50. Гурская Ю.А. Словарь имён собственных в поэзии М.Богдановича / Ю.А.Гурская. – Минск, 1997.

51. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск, 1974.

52. Завальнюк, У. М. Слоўнік асабовых уласных імён / У. М. Завальнюк, В. К. Раманцэвіч. – Мінск, 2017.

53. Казаков, В. С. Именослов: Словарь славянских имён и прозвищ с толкованием их значения и происхождения / Вадим Казаков. – Москва–Калуга, 2007.

54. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Мін. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск, 2003.

55. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Гродзен. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск, 2004.

56. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Гомел. вобл. : нармат. давед. / Н. А. Багамольнікава [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск, 2006.

57. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Магілеўс. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск, 2007.

58. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Віцеб. вобл. : нармат. давед. / У. М. Генкін [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск, 2009.

59. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Брэсц. вобл. : нармат. давед. / І. А. Гапоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. В. П. Лемцюговай. – Мінск, 2007.

60. Никонов, В. А. Краткий топонимический словарь / В. А. Никонов. – М., 1966.

61. Подольская, Н. В. Словарь русской ономастической терминологии / Н. В. Подольская. – М., 1988.

62. Рагаўцоў, В. І. Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны / В. І. Рагаўцоў, С. Я. Кечык ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова. – Магілёў : МДУ, 2000.

63. Редько, Ю. К. Сучасні українські прізвища / Ю. К. Редько. – Київ, 1966.

64. Справочник личных имён народов РСФСР. – М., 1979.

65. Суперанская, А. В. Словарь народных форм русских имён / А.В. Суперанская. – М., 2010.

66. Трійняк, І. І. Словник українських імен / І. І. Трійняк. – Київ, 2005.

67. Тупиков, Н. М. Словарь древнерусских личных собственных имён / Н. М. Тупиков. – СПб., 1903.

68. Федосюк, Ю. А. Русские фамилии : популяр. этимологич. сл-рь / Ю. А. Федосюк. – 7-е изд., стереотип. – М., 2011.

69. Яшкін, І. Я. Беларускія геаграфічныя назвы / І. Я. Яшкін. – Мінск, 1971.

70. Tichoniuk, B. Imiona i ich formy na pograniczu polsko-białoruskim od wieku XVI do roku 1839 / Bazyli Tichoniuk. – Zielona Góra, 2000.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КСР

**Тэма: “Айчынная і замежная анамастычная лексікаграфія”.**

**Заданне.** Падрыхтаваць кароткія вусныя тэматычныя паведамленні, у якіх асвятляліся б наступныя пытанні:

а) у чым заключаецца спецыфіка лексікаграфічнай апрацоўкі анамастычнага матэрыялу;

б) якія віды онімаў на сённяшні дзень падлеглі лексікаграфічнай сістэматызацыі;

в) якія кірункі развіцця анамастычнай лексікаграфіі з’яўляюцца ў сучаснай лінгвістыцы найбольш перспектыўнымі;

г) якія новыя слоўнікавыя праекты ў галіне анамастыкі існуюць у айчыннай і замежнай лінгвістыцы.

**Тэма: “Беларуская антрапаніміка як навука”.**

**Заданне.** Падрыхтаваць кароткія вусныя тэматычныя паведамленні, у якіх асвятляліся б наступныя пытанні:

а) які асноўны аб’ект вывучэння антрапанімікі;

б) як антрапаніміка звязана з іншымі навукамі лінгвістычнага і нелінгвістычнага профілю;

в) хто з’яўляецца пачынальнікам беларускай антрапанімічнай школы, якія кірункі дзейнасці антрапаністаў асабліва актуальныя на цяперашнім этапе развіцця антрапапнімікі;

г) якія асноўныя дасягненні мае беларуская гістарычная антрапаніміка, хто з даследчыкаў распрацоўвае гэтую галіну антрапанімічнай навукі;

д) хто з антрапаністаў і ў якім рэчышчы вывучае антрапаніміконы літаратурна-мастацкіх твораў.

**Тэма: “Неафіцыйныя найменні ў антрапанімічнай сістэме”.**

**Заданне.** Падрыхтаваць кароткія вусныя тэматычныя паведамленні, у якіх асвятляліся б наступныя пытанні:

а) функцыянальная эвалюцыя такога іменалагічнага кампанента як мянушкі;

б) разнавіднасці сучасных мянушак (індывідуальныя, групавыя, родавыя);

в) прычыны ўзнікнення, асноўныя характарыстыкі і разнавіднасці псеўданімаў;

г) вызначальныя характарыстыкі, функцыянальнае прызначэнне, лексіка-семантычныя і структурныя тыпы такіх неафіцыйных нацменняў як камп’ютарныя нікі.

**Тэмы: “Айконімы”, “Мікратапонімы”, “Гідронімы”.**

**Заданне.** Падрыхтавацца да вуснага адказу па наступных пытаннях:

а) як класіфікуюцца тапанімічныя найменні (айконімы, мікратапонімы, гідронімы) паводле семантычнай аднесенасці і структуры;

б) якія групы тапонімаў (айконімаў, мікратапонімаў, гідронімаў) паводле паходжання вылучаюцца ў беларускай тапанімічнай сістэме. Укажыце на карце Беларусі тапанімічныя адзінкі балцкага, цюркскага, нямецкага, фінскага паходжання;

в) раскажыце пра зніклыя або змененыя ў выніку перайменавання беларускія тапанімічныя найменні;

г) прывядзіце прыклады тапанімічных варыянтаў на беларускай тэрыторыі;

д) прывядзіце прыклады вяртання старых назваў беларускіх тапонімаў, якія падлеглі скажэнням або неапраўданым заменам;

е) якім чынам вырашаюцца пытанні нармалізацыі і стандартызацыі ў галіне беларускай тапаніміі; назавіце існуючыя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць нарматыўнае ўжыванне беларускіх тапонімаў.

**Тэма: “Спецыфіка літаратурнай анамастыкі”.**

**Заданне.** Падрыхтавацца да вуснага адказу па наступных пытаннях:

а) якія функцыі выконваюць анамастычныя адзінкі ў структуры мастацкага тэксту;

б) якімі якасцямі тэксту прадвызначаецца склад і фармальныя характарыстыкі літаратурных онімаў;

в) прывесці прыклады ўжывання ў тэкстах беларускіх аўтараў так званых “гаворачых” онімаў;

г) што такое прэцэдэнтныя анамастычныя адзінкі; прывесці іх ужывання ў літаратурных кантэкстах;

**Тэма: “Арфаграфічнае афармленне анамастычнай лексікі”.**

**Заданне.** Выканаць тэставыя заданні па тэме**.**

Пры падрыхтоўцы да тэсту звярнуць увагу на наступныя пытанні:

а) неабходнасць спецыфічнага падыходу да пісьмовага афармлення онімаў;

б) два супрацьлеглыя спосабы пісьмовай перадачы антрапонімаў у перыяд фарміравання правапісных традыцый на пачатку XX стагоддзя;

в) супярэчлівыя арфаграмы з анамастычнымі адзінкамі ў сучаснай пісьмовай практыцы.

**Тэма: “Скланенне онімаў”.**

**Заданне.** Выканаць кантрольную работу па тэме**.**

Пры падрыхтоўцы да кантрольнай звярнуць увагу на наступныя пытанні:

а) асаблівасці скланення беларускіх прозвішчаў на пачатковым этапе фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы (XIX – пачатак XX стагоддзя);

б) сучасныя правілы словазмянення онімаў;

в) спрэчныя арфаграмы, якія датычаць пісьмовай перадачы анамастычных адзінак.

**Тэма: “Перадача беларускіх онімаў па-руску”.**

**Заданне.** Выканаць пісьмовыя практычныя заданні па тэме**.**

Пры падрыхтоўцы да тэсту звярнуць увагу на наступныя пытанні:

а) пазіцыі, у якіх найчасцей адзначаюцца недакладнасці пры перадачы беларускіх анамастычных адзінак па-руску;

б) шляхі нармалізацыі рускамоўнага афармлення беларускіх прозвішчаў;

в) аналіз існуючых “Тэхнічных кодэксаў” па перадачы беларускай тапанімчнай лексікі на беларускую мову.

**Тэма: “Пытанні транслітарацыі онімаў лацінскай графікай”.**

**Заданне.** Выканаць тэставыя заданні па тэме**.**

Пры падрыхтоўцы да тэсту звярнуць увагу на наступныя пытанні:

а) традыцыйная беларуская лацінка і яе прымяненне пры перадачы беларускіх геаграфічных найменняў;

б) спецыфіка транслітарацыі беларускіх антрапонімаў лацінскай графікай: аналіз дзеючай сістэмы беларуска-англійскай лацінкі;

в) прапановы па ўдасканаленні прымянення лацінкі ў межах беларускай анамастычнай сістэмы;

**Тэма: “Вызначэнне матывацыйных асноў онімаў”.**

**Заданне.** Падрыхтаваць разгорнутае паведамленне (даклад) па адно з наступных тэм**:**

а) спецыфіка анамастычнай этымалогіі;

б) выкарыстанне гістарычных, этнаграфічных, дыялектных даныя пры вызначэнні паходжання і семантыкі онімаў;

в) навуковая і народная этымалогія онімаў, іх практычнае і пазнавальна-выхаваўчае значэнне.

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

1. Вуснае апытанне.
2. Тэматычнае паведамленне.
3. Даклад.
4. Практычныя пісьмовыя заданні.
5. Тэст.
6. Кантрольная праца.
7. Экзамен.

## МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ВЫНІКОВАЙ АДЗНАКІ

Выніковая адзнака фарміруецца на аснове:

1. Правіл правядзення атэстацыі студэнтаў (Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 53 ад 29 мая 2012 г.);
2. Палажэння аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў БДУ (Загад рэктара БДУ ад 18.08.2015 № 382-ОД);
3. Крытэрыяў ацэнкі ведаў студэнтаў (ліст Міністэрства адукацыі ад 22.12.2003).

**ПРАТАКОЛ**
**УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы по вучэбной дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Тэорыя імя ўласнага | кафедра сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта | прапаноў няма | змен не патрабуецца пратакол № 10 ад 11.05.2018 |
| Этналінгвістыка | кафедра сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта | прапаноў няма | змен не патрабуецца пратакол № 10 ад 11.05.2018 |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ**
**Ў ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЕ УВА**
**НА _________ / _________ ВУЧЭБНЫ ГОД**

| № п/п | Дапаўненні і змены | Абгрунтаванне |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
________________________________ (пратакол № ____ ад __________ 20___ г.)

Загадчык кафедры

_____________________ ___________________ ______________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта

_____________________ ___________________ ______________________